# ІХ МАЛАДОСЦЬ АБПАЛЕНА ПАХОДАМІ

★

**РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ШАХЦЁР» НАПЯРЭДАДНІ СЛАЎНАГА 50-ГОДДЗЯ ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ СССР ПРАВЯЛА СУСТРЭЧУ З БЫЛЫМІ ВОІНАМІ, ВЕТЭРАНАМІ МНОГІХ БАЁЎ ЗА РАДЗІМУ. НА ГЭТАЙ СУСТРЭЧЫ ПРЫСУТНІЧАЛІ ГАРВАЕНКОМ ПАДПАЛКОЎНІК М.Ф. СІДОРАНКА, СТАРШЫ ДЫСПЕТЧАР ПЕРШАГА КАЛІЙНАГА КАМБІНАТА, АФІЦЭР ЗАПАСУ А. І. ЖУЙКО, ДЫРЭКТАР ДРУГОЙ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ, КАПІТАН ЗАПАСУ М. А. МАРКЕВІЧ, КАВАЛЕР ТРОХ ОРДЭНАЎ СЛАВЫ, НАМЕСНІК НАЧАЛЬНІКА ЭЛЕКТРАЦЭХА ДРУГОГА КАЛІЙНАГА КАМБІНАТА А. І. ДЗІУЛІН, СЛЕСАР УМ-108 М. Д. ЯРАШЧУК, ЭЛЕКТРАСЛЕСАР ДОСЛЕДНАЙ АБАГАЧАЛЬНАЙ ФАБРЫКІ В. А. ЯБЛОНСКІ, НАМЕСНІК ДЫРЭКТАРА ГОРНАХІМІЧНАГА ТЭХНІКУМА ІМЯ МАРЫСА ТАРЭЗА Г. Я. ШКОРБУЛЬ, МЕХАНІК УМ-108 Л. Н. ЦІЦЕНКА, НАЧАЛЬНІК АХОВЫ ПЕРШАГА КАЛІЙНАГА КАМБІНАТА І. І. ШТАНЬКО, ДЫРЭКТАР КБА, ПАДПАЛКОЎНІК ЗАПАСУ Ф. С. СПІРЫН, МАЕР ЗАПАСУ І. М. СЯНКЕВІЧ І КІРАЎНІК НЯШТАТНАГА АДДЗЕЛА ВАЕННА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ РАБОТЫ АБ'ЯДНАНАЙ ГАЗЕТЫ «ШАХЦЁР», РАБОТНІК ВАЕНКАМАТА МАЕР ТАВ. ЯСТРАБАЎ.**

**У ПАЧАТКУ СУСТРЭЧЫ ПАДПАЛКОЎНІК М. Ф. СІДОРАНКА ГАРАЧА ПАВІНШАВАЎ УСІХ ПРЫСУТНЫХ, А Ў ІХ АСОБЕ І ЎСІХ АФІЦЭРАЎ, СТАРШЫН, СЕРЖАНТАЎ І РАДАВЫХ ЗАПАСУ ГОРАДА І РАЁНА СА СЛАЎНАЙ ДАТАЙ У ЖЫЦЦІ КОЖНАГА — 50-ГОДДЗЕМ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ, ПАЖАДАЎ ДОБРАГА ЗДАРОЎЯ, ПЛЁННЫХ ПОСПЕХАЎ У ВАЕННА-ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ МОЛАДЗІ І ПРАЦЫ НА КАРЫСЦЬ ЛЮБІМАЙ РАДЗІМЫ.**

**ВЕТЭРАНЫ ЎСПОМНІЛІ АБ БЫЛЫХ БАЯХ І ПАХОДАХ, АБ СЛАЎНЫХ СТАРОНКАХ САВЕЦКАЙ АРМІІ, РАСКАЗВАЛІ, ЯК ГАРТАВАЛАСЯ МОЦ НАШАЙ АРМІІ, ЯК СКЛАДВАЛІСЯ І РАЗВІВАЛІСЯ ЯЕ БАЯВЫЯ ТРАДЫЦЫІ. НЕКАТОРЫЯ З ГЭТЫХ УСПАМІНАЎ МЫ ЗМЯШЧАЕМ НА ГЭТАЙ СТАРОНЦЫ.**

## АРМІЯ МЯНЕ ЗАГАРТАВАЛА

ПЕРШЫМ папрасіў слова Аляксандр Іванавіч Жуйко. Яго грудзі ўпрыгожваюць два ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны, многія баявыя медалі.

— Служба ў Савецкай Арміі — ганаровы абавязак кожнага грамадзяніна Краіны Саветаў,—гаворыць т. Жуйко.— Я прызываўся на абавязковую вайсковую службу ў 1939 годзе. Да арміі працаваў механікам МТС. У арміі закончыў танкавае вучылішча. А хутка пачалася і вайна. Удзельнічаў у многіх баях, вызваляў ад нямецкіх захопнікаў родныя гарады Беларусі — Оршу, Мінск, Маладзечна, Ваўкавыск, ваяваў на тэрыторыі братніх рэспублік Латвіі і Эстоніі, вайну закончыў у Кенігсбергу (зараз Калінінград).

Сёння прыпамінаючы службу ў арміі, я хачу зазначыць, што яна мяне загартавала, навучыла пераадольваць цяжкасці. Наша моладзь павінна рыхтаваць сябе да службы ў радах Савецкіх Узброеных Сіл. І мы, ветэраны, павінны вучыць моладзь любіць сваю Радзіму, быць заўсёды гатовымі абараняць яе ад ворагаў.

## У БАЯХ МЫ НАБЛІЖАЛІ ПЕРАМОГУ

ЯК БЫ працягваючы расказ т. Жуйко, у гутарку ўключыўся дырэктар другой Салігорскай сярэдняй школы, капітан запасу т. Маркевіч. Ён марыў з юнацтва быць педагогам, але вераломны напад ворага на нашу Радзіму заставіў змяніць планы. На ўсё жыццё застанецца ў памяці вучоба ў ваенна-палітычным вучылішчы. Літаральна ў складзе вучылішча т. Маркевіч прыняў першыя баі з гітлераўцамі на подступах да Масквы.

Тав. Маркевіч расказвае таксама аб жорсткіх баях з ворагам, калі ён рваўся да Каўказа. Так званая «блакітная лінія» лічылася немцамі непрыступнай крэпасцю. Аднак вораг пралічыўся. Імкненне савецкіх воінаў хутчэй разграміць фашысцкіх захопнікаў было так вялікае, што пад ударамі нашых войск трашчала абарона гітлераўцаў.

Даўно закончылася вайна. Пасля дэмабілізацыі Мікалай Антонавіч зноў бярэцца за вучобу, заканчвае спачатку юрыдычны, а затым педагагічны інстытут і ўжо 25 гадоў працуе на педагагічнай рабоце.

— Мы, педагогі, — заканчваючы выступленне, гаворыць т. Маркевіч, — не толькі ўзбройваем навучэнцаў асновамі навук. Мы вучым іх пераймаць баявыя і рэвалюцыйныя традыцыі нашага народа, любіць сваю Радзіму, нашу Армію, рыхтаваць сябе да службы ў яе радах.

## СМЕЛАГА КУЛЯ НЕ БЯРЭ

НА ГРУДЗЯХ Аляксандра Іосіфавіча Дзіуліна тры ордэны салдацкай Славы. Яго ведаюць многія ў Салігорску, ведаюць на Другім калійным, дзе ён працуе. Але наўрад ці ўсе ведаюць, як храбра біўся юнак з ворагам. Расказ мужнага воіна быў з цікавасцю выслуханы сабраўшыміся. Ён расказвае аб баях на тэрыторыі Германіі, куды прыйшла Савецкая Армія ў 1945 годзе, каб пакончыць з вайной. Дзевяць атак азвярэлых гітлераўцаў адбіла толькі за адны суткі невялікая горстка смельчакоў на чале з Аляксандрам Іосіфавічам. Затым баі за Одэр.

— Я пераканан,—гаворыць Аляксандр Іосіфавіч, —толькі смеласць і адвага перамагаюць у баі. Нездарма салдаты гавораць, што смелага і куля баіцца. У гэтым я пераканаўся не раз, калі бачыў, як бясстрашна біліся савецкія воіны за разгром ворага.

## ДРУЖБА НАРОДАЎ— СІЛА АРМІІ

У РАДАХ Савецкай Арміі служаць і служылі ўсе народнасці вялікай краіны. Іменна дружба ўсіх брацкіх народаў дае сілу арміі. Аб гэтым гаварыў Мікалай Дзям'янавіч Ярашчук. Ён праслужыў у Савецкай Арміі 23 гады, прайшоў суровую школу вайны, на яго грудзях дзесяць баявых урадавых узнагарод. Ва ўзводзе, якім камандаваў т. Ярашчук, рука ў руку змагаліся з ворагам рускія, украінцы, беларусы, туркмены, грузіны і іншыя.

— Аб гэтай дружбе я ўспамінаю заўсёды, —гаворыць Мікалай Дзям'янавіч.— Вось і на днях я праводзіў гутарку аб арміі сярод школьнікаў. Я гаварыў, што дружба народаў —залог нашай магутнасці.

Гэтую думку прадоўжыў у гутарцы Васіль Анатольевіч Яблонскі. 22 гады ён праслужыў у арміі, там атрымаў сярэднюю агульную, а затым і сярэднюю спецыяльную адукацыю, прайшоў вялікую школу жыцця, на грудзях яго 12 баявых узнагарод.

Побач з ордэнамі і медалямі—на грудзях значок «Ударнік камуністычнай працы». Яго атрымаў Васіль Анатольевіч ужо на абагачальнай фабрыцы, дзе працуе электраслесарам.

— Моладзь, якая ідзе зараз служыць у армію, фізічна здаровая, пісьменная, высокасвядомая, — сказаў т. Яблонскі. Ён называе імёны Васілеўскага, Корбута, Карповіча і многіх іншых, якія з фабрыкі пайшлі на абавязковую службу ў Савецкую Армію.

## ДАРОГАМІ ВАЙНЫ І ПЕРАМОГ

З УВАГАЙ слухалі расказ удзельніка Сталінградскай бітвы тав. Шкорбуля. Яго грудзі ўпрыгожваюць чатыры ордэны і дзевяць медалёў. Яшчэ ў 1939 годзе Георгій Якаўлевіч удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі ад ярма польскіх магнатаў. Айчынную вайну ён сустрэў пад Вільнюсам. Цяжкія шляхі адступлення. Першая баявая ўзнагарода — медаль «За адвагу» — атрымана за бой на захад ад г. Ельні. Затым Сталінград. Механік-вадзіцель т. Шкорбуль на «Т-34» бязлітасна біў фашыстаў, быў цяжка паранены, але не пакінуў экіпаж. У 1942 годзе ён атрымаў партыйны білет. І зноў баі, паходы, глыбокія рэйды. Закончыў вайну паўночней Берліна.

Прайшло шмат часу, як т. Шкорбуль дэмабілізаваўся і прысвяціў сябе мірнай працы. Але ён не парывае сувязі з арміяй, часта сустракаецца з баявымі таварышамі, якія разам служылі і ваявалі, многа праводзіць гутарак з студэнтамі тэхнікума на ваенна-патрыятычныя тэмы, расказвае аб слаўным баявым шляху Савецкай Арміі.

Шмат цікавага расказаў і другі былы механік-вадзіцель танка т. Ціценка. Ён удзельнік баёў з японскімі самураямі на возеры Халхін-Гол (1939 г.), затым многія баі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у 1942 годзе прыняты ў рады КПСС. І што характэрна: вайну т. Ціценка закончыў у Маньчжурыі, калі была разгромлена Квантунская армія.

## КАМАНДЗІР ТАНКАВАЙ РОТЫ

ШМАТ цікавага прыпомніў і падпалкоўнік запасу Ф. С. Спірын, які зараз працуе дырэктарам КБА. Ён прызван у Савецкую Армію ў 1936 годзе. Вайну сустрэў на пасадзе камандзіра танкавага ўзвода. Прыпамінаючы баі і воінаў, т. Спірын расказвае аб мужнасці нашых салдат, афіцэраў, аб іх уменні наносіць удары па ворагу там, дзе іх не чакалі. Баі за Берлін, вызваленне горада Кладно (Чэхаславакія) — гэта заключны этап службы т. Спірына.

Цяпер т. Спірын часта па запрашэнню настаўнікаў бывае ў школах, расказвае аб баявым шляху Савецкай Арміі нашым дзецям, піянерам.

— Прызнацца, я лічу і цяпер сябе ваенным, — гаворыць Ф. С. Спірын. —Палюбіў армію, ёй аддаў 22 гады свайго жыцця.

Падзяліліся сваімі ўспамінамі аб службе ў Савецкай Арміі таксама афіцэры запасу І. І. Штанько і І. М. Сянкевіч.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 лютага 1968 года група былых воінаў за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.*

*Іх прозвішчы будуць апублікаваны ў заўтрашнім нумары «Шахцёра».*



НА ЗДЫМКУ: УДЗЕЛЬНІКІ РЭДАКЦЫЙНАЙ СУСТРЭЧЫ, ВЕТЭРАНЫ БАЁЎ.